З нагоды

# Свята тых, хто любіць кнігу

**У Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адбыўся семінар па пытаннях бібліятэчнай справы для работнікаў галіны з усёй краіны. Сустрэча была прысвечана Дню бібліятэк.**

Абмяркоўваліся пытанні, якія датычацца паўсядзённага жыцця бібліятэкараў: нарматыўнае фінансаванне, становішча і запатрабаванасць бібліятэк за апошнія 5 гадоў, а таксама перспектывы.

Перад кіраўнікамі бібліятэк Беларусі выступіла Святлана Крупко, начальнік фінансава-эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры. Яна растлумачыла, што такое нарматыўнае фінансаванне бібліятэк, калі яно пачне працаваць і з чаго складаецца, распавяла, для чаго трэба пераходзіць да праекта: «Гэта і забеспячэнне адзіных падыходаў у фарміраванні бюджэтнага фінансавання, і празрыстае і справядлівае размеркаванне сродкаў. Пры гэтым будзе магчымасць фінансаваць пры патрэбе больш, чым прадугледжана дакументам. Грошы на надбаўкі супрацоўнікам будуць выдзяляцца асобна, ніхто не будзе абдзелены».

Дакумент уступіць у сілу з 1 студзеня 2024 года.

Ірына Карповіч, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры, выступіла на семінары з дакладам пра стан бібліятэк: «Мяне не вельмі радуюць тыя змены, якія адбываюцца ў бібліятэчнай сферы на працягу 5 гадоў. Трэба ўмець жыць у тых рэаліях і думаць, як зрабіць умовы лепшымі». Канстатавалі, што колькасць бібліятэк змяншаецца. Калі ў 2018 годзе па краіне іх было 2551, то на канец 2022-га — 2263. Даводзіцца аптымізавацца шляхам закрыцця і аб'яднання.

Спікеры адзначылі, што колькасць наведвальнікаў падае. У сучасным свеце трэба рабіць упор на сайты і віртуальных карыстальнікаў. Тычыцца гэта і населеных пунктаў, дзе бібліятэкі закрываюцца. Там, між іншым, працуюць біблiёбусы.

На сустрэчы выступіў Вадзім Гігін — генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, які выказаў меркаванне па некаторых пытаннях, што датычацца ўсёй краіны: «Ёсць людзі з рознымі поглядамі, але дзяржава сваю палітыку не змяняе. Ніякай полiварыянтнасці не будзе. Гэта інструмент гуманітарнай бяспекі. Мы павінны ўважліва сачыць за інфармацыйным асяроддзем».

Адбылася цырымонія ўзнагароджання пераможцаў XXXI Рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка — асяродак нацыянальнай культуры». У 4-х намінацыях — «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», «За навацыі ў галіне бібліятэчнай справы», «За пошуковую і даследчую працу», «За падтрымку і развiццё чытання» — найлепшымі сталі 22 бібліятэкі.

Ларыса Касцюк, загадчыца Навагрудскай бібліятэкі сямейнага чытання, якая атрымала дыплом першай ступені ў намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем», адзначыла: «Штогод мы сачылі і радаваліся поспехам нашых калег. І вось, дзякуючы ўласным намаганням і прафесіяналізму, перамога ў гэтым годзе ў нас. Сёння бібліятэкі іграюць важную ролю ў выхаванні моладзі і падтрымцы патрыятызму. Там працуюць людзі, якія любяць сваю працу, тых, хто прыходзіць у бібліятэку».

**Ксенія МОЖАР**